■ На экранах

# Марыя Магдаліна зноў стала каханай

## Аўтар намінаванага на «Оскар» фільма «Леў» у нашых кінатэатрах

**Мы паглядзелі чарговы фільм пра жыццё Ісуса Хрыста, толькі гэтым разам убачылі біблейскі сюжэт вачыма апостала Марыі Магдаліны — той, што насуперак сваёй сям'і пайшла за Хрыстом, пераадолела разам з ім складаны шлях да смерці на крыжы і першай убачыла яго пасля ўваскрэсэння. Стваральнікі фільма «Марыя Магдаліна», і ў прыватнасці рэжысёр Гарт Дэвіс, з гучным слоганам «яе гісторыя будзе расказана ўпершыню» сканцэнтраваліся на сціплай, але адважнай жаночай фігуры — яе перажываннях, падтрымцы і яе... любові. Ці каханні?**



Хочаш не хочаш, а пытанне пра пачуцці паміж Хрыстом і Марыяй узнікае. Вонкава карціна выглядае надзвычай нявінная — аскетычныя пейзажы і дамы, традыцыйная грамадства, простая работа людзей, іх звычайныя жаданні, закрытае адзенне, вочы ўніз. Але здаецца, Гарт Дэвіс гулліва папрацаваў з другім планам, дзе рухі, позіркі і словы гавораць пра патаемныя пачуцці, а галоўнае — самі акцёры правакуюць смелыя дапушчэнні. Хаакін Фенікс і Руні Мара з іх фільмаграфіяй, папулярнымі вобразамі, гісторыямі кахання, сексуальнымі сцэнамі наўрад ці падыходзяць на ролі галоўных біблейскіх персанажаў, калі толькі іх жыццёвы багаж не павінен за сабой нешта прынесці. Прынамсі, гэта цікавы кірунак развag, як мінулае акцёраў уплывае на стварэнне важных вобразаў.

Увогуле сюжэты, у якіх Ісус Хрыстос з Марыяй Магдалінай выступаюць парай — канешне, не навінка, даходзіць нават да непрыстойных анекдотаў. Затое ў фільме Гарта Дэвіса вы знойдзеце вельмі далікатную і ледзь заўважную сэнсавую лінію, у якой каханне Марыі Магдаліны падтрымлівае Хрыста ў час яго турбот, а ён пасля смерці ў першую чаргу прыходзіць да «каханай».

Гэтай далікатнасцю вартасці карціны, напэўна, абмяжоўваюцца, бо ў цэлым «Марыя Магдаліна» стала зборам уласных і не вельмі цікавых поглядаў на вядомы сюжэт і банальных дыялогаў без мэты і грунтоўнага сэнсу. Аўтары зрабілі Марыю Магдаліну галоўным персанажам — жанчына аказалася сярод апосталаў, села поруч з Хрыстом падчас тайнай вячэры, змагла выказаць свае меркаванні (да якіх прыслухоўваюцца). Адсюль у лік апосталаў увайшлі афраамерыканцы, а адсюль — фільм стаў звычайным кан'юнктурным праектам, таму пра чыстае мастацтва, пасыл і аўтарскае бачанне думаць складана.

Цікава таксама, як прапісаны ў фільме вобраз Марыі Магдаліны. Яе абавязак служыць натхненнем і падтрымкай Хрысту, канешне, адсеяў сумненне, але папулярнае прадстаўленне гераіні як блудніцы. Відаць, такое рэнамэ не ўпісалася б у светлы вобраз, які імкнуліся перадаць аўтары. У цэлым у іх, канешне, ёсць права карыстацца рознымі прачытаннямі, хоць для мяне гэта чарговае ігнараванне адмоўных бакоў персанажаў і імкненне такім чынам «абяліць» герояў замест таго, каб прыняць іх такімі, якія яны ёсць.

Вядомы здраднік Іуда ў карціне Гарта Дэвіса таксама паказаны даволі своеасабліва — у нас ёсць нагоды падазраваць, што ён — вар'ят, і не тое каб здрадзіў Хрысту, а вырашыў, што той спужаўся і трэба дапамагчы яму ахвяраваць сабой, каб прыйшло Божае царства, а Іуда мог уз'яднацца з сям'ёй. Чарговая спроба перапісаць вядомы ўчынак замест таго, каб прыняць яго.

«Марыя Магдаліна» можа быць цікавай выключна тым, як камерцыйны фільм прачытвае Біблію і паказвае яе на экране. Дзіўнаватыя рашэнні прывялі да дзіўнаватага выніку — карціна Гарта Дэвіса (летась яго фільм «Леў» быў намінаваны на «Оскар») прэтэндуе на «новы позірк», але нічога новага ў сабе не нясе. Як і прыгожага, грунтоўнага, вечнага.

Фільм «Марыя Магдаліна», апроч іншага, у час барацьбы за гендарнае раўнапраўе аказаўся даволі недарэчнай спробай замацаваць месца жанчыны сярод мужчын. Таму што пракладваць ёй шлях у гэты свет праз «абяленне» і адмаўленне хай недакладнага, але распаўсюджанага вобраза распуснай жанчыны — значыць прымацы яе толькі ў зручным для сябе вобразе. Такое суседства кан'юнктуры і метадаў расказваць гісторыю нараджае дадатковыя сэнсы, свядомыя альбо не — нам невядома.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.16 | 20.05 | 13.49 |
| Віцебск — | 6.03 | 19.58 | 13.55 |
| Магілёў — | 6.06 | 19.56 | 13.50 |
| Гомель — | 6.06 | 19.49 | 13.43 |
| Гродна — | 6.32 | 20.20 | 13.48 |
| Брэст — | 6.35 | 20.18 | 13.43 |

### Месяц

*Апошняя квадра 8 сакавіка.*

*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

*Пр. Івана, Засімы, Сафрона.*

*К. Віктара, Зянона, Юліяна.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 12 КРАСАВІКА




**1753** год — нарадзіўся (Навагрудчына) Ануфрый Маркевіч, беларускі асветнік, юрыст. Скончыў Віленскі ўніверсітэт. У адзінай вядомай працы «Пра ўдасканаленне прыроды ў стварэнні чалавека» выклаў ідэі эвалюцыянізму, матэрыялізму ў антрапагенезе, антрапалагічнага гуманізму. Чалавек для Ануфрыя Маркевіча — вынік працяглай дзейнасці прыроды ў яе развіцці. Выступаў супраць ненавуковых, містыка-тэалагічных здагадак, аргументавана крытыкаваў зародкі расісцкіх канцэпцый. Памёр у 1807 годзе.

**1890** год — нарадзіўся (в. Шчорсы, цяпер у Навагрудскім раёне) Янка Нёманскі (Іван Андрэевіч Пятровіч), беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі (1928). У 1915—1916-м і ў 1918 годзе вучыўся ў Петраградскім універсітэце. Працаваў у Беларускім нацыянальным камісарыяце, сумесна з Цішкам Гартным рэдагаваў газету «Дзянніца». У 1919—1921 гадах быў у Чырвонай Арміі. Працаваў у планава-эканамічных органах БССР, быў намеснікам старшыні Дзяржплана рэспублікі. Браў удзел у рабоце Інбелкульта. У 1929—1931 гадах неадменны сакратар Прэзідыума Беларускай АН і адначасова — вучоны сакратар Інстытута эканомікі. Апублікаваў больш за 30 навуковых і літаратурных прац. Аўтар артыкулаў па пытаннях эканомікі, гісторыі і культуры Беларусі, а таксама рамана «Драпежнікі», аповесці «Партызаны», апавяданняў. У 1937 годзе рэпрэсаваны і асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.



**1912** год — нарадзіўся (г. Рэчыца) Яфім Захаравіч Капелян, савецкі акцёр, артыст Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра, народны артыст СССР. Здымаўся ў фільмах «Час, наперад!», «Мікалай Бауман», «Злачынства і пакаранне», «Няўлоўныя мсціўцы», «Вечны кліч» і інш. Адна з найбольш вядомых работ — чытанне тэксту ад аўтара ў тэлесерыяле «Сямнаццаць імгненняў вясны». Прымаў удзел у дубляжы замежных фільмаў на кінастудыі «Ленфільм». Адначасова шмат працаваў на тэлебачанні. Спрабаваў сябе ў рэжысуры, паставіў некалькі спектакляў на Ленінградскім тэлебачанні. Памёр у 1975 годзе.




**1883** год — нарадзіўся Аляксандр Васілевіч Аляксандраў, савецкі кампазітар, харавы дырыжор, педагог, народны артыст СССР. Аўтар музыкі Дзяржаўнага гімна Савецкага Саюза, ваенна-патрыятычных песень. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1942, 1946). Памёр у 1946 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

**Я гатовы выкінуць амаль новую штучную ёлку, толькі ўключыце вясну!**

— Хлопцы, у каго ёсць падручнікі па квантавай фізіцы, вышэйшай матэматыцы ці генетыцы? Дайце, калі ласка.

— Вой, малайчына якая! Вырашыла за навуку ўзяцца?

— Мне для фотасесіі.

**Мы пасылаем у космас сваіх найлепшых, разумных, здаровых мужыкоў, а іншапланецяне, мярзотнікі, нейкіх маленькіх шэрых і зялёных выррадкаў!**

— Не, Пятровіч, ну ты падумай! На двары XXI стагоддзе, а гэтыя бессардэчныя, недаразвітыя маргіналы з ларка адмовіліся прадаць за біткойн бутэльку гарэлкі!..

**Менеджар адэскага банка Якаў Саламонавіч такі ўгаварыў рабаўніка ўзяць яйшчэ і іпатэчны крэдыт.**

— Калі я не памыляюся, заўтра ў тваіго мужа дзень нараджэння? Які падарунак ты яму падрыхтавала?

— Не ведаю нават, што яму купіць. У яго ўжо ёсць усё, што мне трэба.

З днём нараджэння, з прыгожай, круглай датай шчыра віншуем шаноўную **Соф'ю Кліменцьеўну ЖЫЛЯК!** Зычым

*...На многія леты — здароўя, дабра!*
*Хай кожны дзянёк будзе ў свята!*
*Хай дом за вярсту абыходзіць бяда,*
*А радасці будзе багата!*

**Сябры з Мінска і ваколіц.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1430.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 красавіка 2018 года.